ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУ "Барысаускі
аб'ядданы музей"
__________ Вязовіч Л.П.
"__"__________2020 г.

Правілы наведвання
дзяржаўнай установы "Барысаўскі
аб'ядданы музей"

## 1. Агульныя палажэнні.

1.1. Дадзеныя Правілы распрацаваны ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры і Статутам дзяржаўнай установы "Барысаўскі аб'ядданы музей" (далей – музей) і накіраваны на забеспячэнне парадку і бяспекі пры наведванні пастаяннай экспазіцыі і часовых экспазіцый музея, на паляпшэнне абслугоўвання наведвальнікаў музея.

1.2. Музей адкрыты для наведвальнікаў штодзённа, акрамя панядзелка (выхадны дзень), з 09-00 да 18-00 без перапынка на абед. У выхадныя і перадсвяточныя дні музей адкрыты для наведвальнікаў з 09-00 да 17-00. Праца музея ў святочныя дні вызначаецца дырэктарам музея ў кожным канкрэтным выпадку.

1.3. Музей ажыццяўляе продаж уваходных білетаў на наведванне пастаяннай экспазіцыі музея і (або) на наведванне часовых экспазіцый музея і прымае аплату за экскурсійнае абслугоўванне па пастаяннай і (або) па часовых экспазіцыях музея праз касу музея.

1.4. Продаж касай музея ўваходных білетаў і аплата за экскурсійнае абслугоўванне спыняюцца ў 17-30.

1.5. Уваходны білет і аплата за экскурсійнае абслугоўванне даюць права на аднаразовае наведванне пастаяннай экспазіцыі музея і (або) аднаразовае наведванне часовых экспазіцый музея і на аднаразовае экскурсійнае абслугоўванне. Для паўторнага наведвання музея ў той жа дзень наведвальнік набывае новы ўваходны білет і ажыццяўляе новую аплату за экскурсійнае абслугоўванне.

1.6. Кошт ўваходных білетаў і экскурсійнага абслугоўвання вызначаецца ў прэйскуранце цэн, які размяшчаецца на касе музея.

1.7. Экскурсійнае абслугоўванне ажыццяўляецца як па папярэдняй заяўцы (тэл.80177732523), так і ў парадку чаргі. Групы, якія не падалі заяўку, абслугоўваюцца пасля заяўленых груп.